Святлана Афанасьева

# ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК СМАРГОНШЧЫНЫ ПА ЗАХАВАННІ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ



**Дырэктар Смаргонскай раённай бібліятэкі**

У сучасных умовах у дзейнасці Смаргонскай раённай бібліятэкі галоўнымі напрамкамі работы з карыстальнікамі з'яўляюцца інавацыі і патрыятычнае выхаванне насельніцтва. На наш погляд, асноўным у патрыятычным выхаванні з'яўляецца краязнаўства. Работа па краязнаўстве садзейнічае развіццю і станаўленню асобы, выхоўвае грамадзяніна.

У 2023 г. філіял «Сасноўская сельская бібліятэка-клуб» прыняў удзел у XXXI Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ў намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы» з работай «Кола гісторыі, ці Вандроўкі па родным краі», атрымаў дыплом I ступені і прэмію ў памеры 50 базавых велічынь.

Філіял «Гарадская бібліятэка № 1» прыняў удзел у Рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання» ў намінацыі «Патрыятычнае выхаванне на праваслаўных традыцыях» і заняў II месца; у абласным конкурсе «Бібліятэка.by» ў намінацыі «Лепшы інфармацыйна-забаўляльны рэсурс» з краязнаўчым анлайн-квестам «Сцежкамі Смаргоншчыны», атрымаў дыплом II ступені.

Смаргонская раённая бібліятэка прыняла ўдзел у II Рэспубліканскім конкурсе «Лепшы публічны цэнтр прававой інфармацыі» ў намінацыі «Лепшы ПЦПІ цэнтральнай раённай (гарадской) бібліятэкі».

У 2023 г. супрацоўнікі філіяла «Гарадская бібліятэка №3» вырашылі праводзіць мэтанакіраваную краязнаўчую работу па зборы гістарычных фактаў генацыду на тэрыторыі Смаргоні і Смаргонскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны і выкарыстоўваць сабраны матэрыял пры правядзенні бібліятэчных мерапрыемстваў для розных груп карыстальнікаў. На падставе сабраных гістарычных фактаў была




Інтэрактыўна-інфармацыйная карта «Без тэрміну даўнасці. Смаргоншчына». Скрыншот з сайта бібліятэкі